Н.М. Пурышава

# ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЛІТЫКА Ў ГАЛІНЕ МАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў 20-Я ГАДЫ: ДА ГІСТАРЫЯГРАФІІ ПРАБЛЕМЫ

Набыццё суверэнітэту і незалежнасці паставіла перад Рэспублікай Беларусь ў шэрагу іншых задачу нацыянальнага адраджэння. Паспяховае вырашэнне гэтай праблемы немагчыма без вывучэння пытанняў гісторыі нацыянальнай культуры. У сувязі з гэтым вельмі цікавым з'яўляецца перыяд "трэцяй хвалі адраджэння" - 20-я гады. У гэты час быў закладзены падмурак усяго станоўчага і адмоўнага, што мы маем на сённяшні дзень як у культуры, так і ў гістарычнай навуцы. Даследаванне ўплыву дзяржаўнай палітыкі на літаратуру і мастацтва ў гэты перыяд з'яўляецца дастаткова актуальным і патрэбным, тым больш, што спецыяльна гэтая праблема не вывучалася. Гістарыяграфічны аналіз гэтага пытання дае магчымасць убачыць цяжкасці, перашкоды і дасягненні на шляху асэнсавання гістарычнай навуковай праблемы дзяржаўнай палітыкі ў галіне мастацкай культуры ў 20-я гады.

Пытанні распрацоўкі, зместу і правядзення ў жыццё палітыкі партыі і дзяржавы ў галіне мастацкай культуры былі прадметам разгляду і вострых дыскусій ужо ў 20-я гады. Аналіз публікацый па гэтай праблеме дазваляе зрабіць выснову аб тым, што нягледзячы на мноства сведчанняў існавання агульных прынцыпаў ў літаратурна-мастацкай палітыцы партыі, яна не мела дакладна распрацаванай канцэпцыі ў гэтай галіне ні да рэвалюцыі, ні адразу пасля яе. Менавіта ў 20-я гады пачынае складацца палітычная мадэль партыйнага кіраўніцтва мастацкай культурай. Асновай яе, з аднаго боку, было прызнанне неабходнасці выкарыстання магчымасцей літаратуры і мастацтва ў справе палітычнага і культурнага выхавання і асветы народа. З другога боку, партыя накінула за сабой прынцыповае права ўмешвацца ў сферу мастацкай культуры і настойліва падкрэслівала сваю кіруючую ролю ў гэтай галіне. Публікацыі 20-х гадоў дазваляюць прасачыць эвалюцыю гэтай мадэлі ад "мяккага" кіраўніцтва, якое дазваляла дыскусіі ў пачатку 20-х гадоў, да адміністрацыйна-камандных метадаў усё больш настойлівага ўвядзення аднадумнасці ў другой палове дзесяцігоддзя. Параўнальна нешматлікія публікацыі таго часу, якія датычаць гэтага перыяду ва ўмовах БССР, даюць уяўленне аб цеснай сувязі дзяржаўнай палітыкі ў галіне мастацкай культуры з працэсамі нацыянальнага адраджэння.

Наогул, публікацыі 20-гадоў па праблемах дзяржаўна-партыйнага кіраўніцтва літаратурай і мастацтвам уяўляюць цікавасць не толькі як гістарычная крыніца, але і як першы вопыт тэарэтычнага асэнсавання праблемы. Асаблівасцю гістарыяграфіі па ўказанай праблеме з'яўляецца тое, што працэсы выпрацоўкі літаратурна-мастацкай палітыкі партыі і яе тэарэтычнага асэнсавання ішлі паралельна. Літаратура 20-х гадоў дае магчымасць "з першых рук" атрымаць уяўленне аб гэтым складаным і супярэчлівым працэсе, адметнай рысай якога з'яўляецца плюралізм, магчымасць дыскусіі, дыялогу з апанентамі.

Наступны этап гістарыяграфічнага засваення ўказанай праблемы пачынаецца з 30-х гадоў і працягваецца да пачатку 90-х гадоў. Тут у сваю чаргу трэба вылучыць 20-я - перш.палову 50-х гг., калі савецкая гістарыяграфічная навука была пастаўлена ў жорсткія рамкі дагматызму. Менавіта ў гэты перыяд на шэрагу тэм быў устаноўлены акрэслены канон даследавання, некаторыя праблемы, у тым ліку і вопыт культурнага будаўніцтва ў 20-я гг., былі наогул выведзены з поля зроку даследчыкаў. У БССР працэс дагматызацыі гістарычнай навукі ўзмацняўся



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

жорсткай барацьбой з так званым нацыянал-дэмакратызмам. У публікацыях гэтага часу, якія закранаюць асобныя бакі ўказанай праблемы, усё што мела дэмакратычную афарбоўку і было звязана з нацыянальным адраджэннем, атрымлівала рэзка негатыўныя ацэнкі. Палітыка партыі ў галіне мастацкай культуры Беларусі зводзілася да выкрыцця і разгрому нацыянал-дэмакратызму ў літаратуры, жывапісе, музыцы. Гістарыяграфія 30-50-гг. не ўнесла ніякага пазітыўнага навукова-тэарэтычнага ўкладу ў вывучэнне праблемы дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры. У гэты перыяд быў закладзены падмурак артадаксальнай канцэпцыі (указанай праблемы), якая была заснавана на палітыцы непагрэшнасці партыі і недапушчэнні крытыкі ў яе адрас.

XX з'езд КПСС і яго пастановы дазволілі савецкай гістарычнай навуцы вызваліцца ад дагматыкі 30-50-х гг., але ў другой палове 50 - пач. 60-х гг. складаецца ідэалагічны канон даследавання праблем культурнай палітыкі партыі з абавязковым наборам штампаў аб "ленінскім плане культурнай рэвалюцыі", "мудрай палітыцы партыі", неабходнасці барацьбы з "варожымі" ўплывамі ў літаратуры і мастацтве і інш.

У 70-80-я гг. ў сувязі з актывізацыяй вывучэння асобых аспектаў праблемы дзяржаўнай палітыкі ў галіне мастацкай культуры быў асвоены і ўведзены ў навуковы абарот значны фактычны матэрыял, вызначалася імкненне вывучаць палітыку партыі і дзяржавы як сістэму мер разнастайнага характару. Аднак якасных зрухаў у даследаванні ўказанай праблемы не адбылося, таму што ўся навуковая тэматыка ў гэтым напрамку была вельмі ідэалагізавана і дагматызавана. У выніку, замест рэальнай палітыкі партыі ва ўказанай вобласці з'явіўся шэраг ідэалагічных міфаў.

Аналагічнае становішча назіраецца ў беларускай гістарыяграфіі гэтага перыяду. Навукоўцы, якія закранальі розныя аспекты палітыкі КП(б)Б у сферы мастацкай культуры ў 20-я гады непазбежна сутыкаліся з практычна невырашальнай у тых умовах праблемай: паказаць працэс нацыянальна-культурнага будаўніцтва, не называючы імёнаў яго ідэолагаў і натхніцеляў, якія актыўна праводзілі ў жыццё палітыку беларусізацыі. Таму з'яўляліся працы, у якіх праблемы дзяржаўнай палітыкі ў галіне мастацкай культуры выкладаюцца надта схематычна і спрошчана, часта фальсіфікуюцца. Аднак аналіз публікацый 50-гг. 80-х гг., якія датычаць указанай праблемы, дазваляе рабіць выснову аб некаторай эвалюцыі ад постсталінісцкай канцэпцыі 50-х гадоў да мадэрнізаванага яе варыянту 70-80 гадоў.

Якасныя зрухі ў даследаванні ўказанай праблемы адбыліся тады, калі КПСС згубіла сваё манапольнае становішча ідэолага. З гэтага часу пашырыўся доступ да архіўных матэрыялаў, знікла ідэалагічная цэнзура, зрабіліся даступнымі публікацыі 20-х гг., замежныя даследаванні па праблеме. Яшчэ ў канцы 80-х гг. з'явіліся першыя публікацыі, у якіх відавочны спробы адарвацца ад дагматычных поглядаў на праблему дзяржаўнай палітыкі ў сферы мастацкай культуры ў 20-х гг., але канчатковы разрыў з кананічнай мадэллю адбыўся ў шэрагу даследаванняў расійскіх і замежных навукоўцаў-літаратуразнаўцаў і гісторыкаў у пач. 90-х гг. У гэтых пакуль нешматлікіх працах прысутнічае пошук новых канцэптуальных падыходаў да распрацоўкі праблемы дзяржаўнай палітыкі ў галіне мастацкай культуры ў 20-я гг. Неабходна адзначыць, што даследаванні па гэтай тэматыцы ідуць вельмі марудна, пераважна па "галіноваму" прынцыпу. На сучасным этапе прыярытэт у даследаванні гэтай тэмы належыць замежным навукоўцам.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Некаторыя зрухі ў канцы 80-х - пач. 90-х гг. адбыліся ў беларускай гістарычнай навуцы. У гэты час пачынаецца працэс фарміравання нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі, выходзіць шмат артыкулаў у перыядычным друку па розных пытаннях нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў рэспубліцы ў 20-я гг. Аднак па тэме, якая нас цікавіць, закранаюцца толькі асобныя аспекты. Акрамя таго, гэтыя матэрыялы не заўсёды задавальняюць патрабаванням аб'ектыўнасці.

Уяўляецца відавочным, што зараз неабходна навуковая, свабодная ад кан'юнктурных падыходаў канцэпцыя 20-х гадоў, якая ўвабрала ў сябе як каштоўныя дасягненні мінулых гадоў, так і новыя падыходы, што ўжо абазначыліся ў некаторых даследаваннях апошняга часу.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова